11. Пенитенциалий св. Куммина // Послушник и школяр, наставник и магистр: Средневековая педагогика в лицах и текстах / Пер. с лат. В.Г. Безрогова. М., 1996. С. 126–128.
12. *Дюбуа Пьер*. Об отвоевании Святой земли // Антология педагогической мысли христианского Средневековья. Т. 2. М., 1994. С. 192–203.
13. Устав пр. Венедикта // Древние иноческие уставы собранные епископом Феофаном. М., 1892. С. 597–653.
14. Устав пр. Иоанна Кассиана // Древние иноческие уставы собранные епископом Феофаном. М., 1892. С. 513–584.
15. Устав пр. Пахомия // Древние иноческие уставы собранные епископом Феофаном. М., 1892. С. 10–210.
16. Устав св. Василия Великого // Древние иноческие уставы собранные епископом Феофаном. М., 1892. С. 244–510.
17. *Филипп Новарский*. Четыре возраста жизни / Пер. С.И. Лучицкой // Антология педагогической мысли христианского Средневековья. Т. 2. М., 1994. С. 142–147.
18. *Эгидий Римский*. О правлении государей / Пер. Н.В. Ревякиной и Т.Б. Рябовой // Антология педагогической мысли христианского Средневековья. Т. 2. М., 1994. С. 149–170.

## ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСНОВЫ РАННЯЙ АМЕРЫКАНСКАЙ ПАЛІТЫЧНАЙ ІДЭАЛОГІІ

**П. Г. Космач**

Ранняя амерыканская палітычная ідэалогія фармавалася пад уплывам некалькіх тэндэнцый: 1) уздым пратэстантызму ў калоніях, (т.зв. «Вялікае абуджэнне») – першы агульнаамерыканскі грамадскі рух [1, с. 87]; 2) асветніцтва і, адпаведна, дэізм [2, с. 48], які адлюстроўваў уплывы рацыяналізму ў кантэксце дасягненняў тагачаснай фізікі (класічная механіка Ньютана) і матэматыкі (распрацоўка дыферэнцыяльнага і інтэгральнага вылічэнняў).

Сацыяльна-палітычныя погляды як прадстаўнікоў Вялікага абуджэння, так і дэізму грунтаваліся на тым, што Сусвет заснаваны на законах, напісаных Вялікім Творцам. Такім чынам пасля адкрыцця законаў Ньютана ў фізічным свеце, засталося вызначыць заканамернасці, якія пануюць у грамадстве. Так, Д. Лок пры абмеркаванні «натуральнага стану» чалавека літаральна прыкладае да вырашэння гэтага пытання прынцып інерцыі Галілея – Ньютана. Амерыканскія асветнікі разумелі практыку Новага свету як галоўны крытэрый любых сацыяльных тэорый [3, с. 186], таму паняцце аб т.зв. «відавочных ісцінах» трапіла ў «Дэкларацыю незалежнасці ЗША».

Творы, дзе ўтрымліваюцца тэматычныя звесткі падзяляюцца на дзве асноўныя катэгорыі: 1) працы аўтараў з паўночнамерыканскіх калоній (Д. Уайз, Б. Франклін, Д. Мэйх’ю, Э. Вільямс); 2) кнігі еўрапейскіх

філосафаў Новага часу (С. Пуфендорф, Т. Гобс, Д. Лок, Ш. Мантэск'е). Ранняя амерыканская ідэалогія грунтавалася на трох канцэпцыях: 1) натуральны стан чалавека і паходжання ўлады; 2) формы кіравання дзяржавай; 3) узаемадачыненні паміж царквой і дзяржавай. Па першай праблеме паходжання (і неабходнасці) улады галоўным пытаннем з'яўлялася тэма аб натуральным стане чалавека. Што датычыцца натуральнага стану у сэнсе канцэпцыі Д. Лока, то некаторыя аўтары лічылі яе практычна неабгрунтаванай, паколькі рэчаіснасць сведчыла аб адваротным, ці, пагаджаючыся ў цэлым, рабілі акцэнт на тым, што людзі як раз найчасцей парушаюць натуральны закон сваёй сутнасці, г.зн. паводзяць сябе ірацыянальна. Таму стварэнне уладных структур неабходна.

Другое пытанне ранняй амерыканскай палітычнай ідэалогіі аб найбольш адэкватнай форме дзяржаўнага кіравання. За аснову большасцю аўтараў прымаўся падзел улады на тры галіны. Перадусім таксама адзначым, што Біблія ўтрымлівае важнейшую перадумову ўзнікнення новага тыпу грамадства, бо Законы Божыя вышэй за законы чалавечыя. Пурытанская дактрына кавенанта, якая ўяўляе трохбаковы дагавор паміж Богам, уладай, людзьмі, і надалей уплывала на грамадска-палітычныя погляды каланістаў. Кардынальнае яе адрозненне ад пазнейшай тэорыі грамадскай дамовы гэта тое, што Бог разумеецца як непасрэдны актыўны суб'ект гістарычнага працэсу. У тэорыі Д. Лока Ён «вынесены за дужкі», а людзі наадварот надзяляюцца правамі на ўстанаўленне рацыянальнага грамадскага парадку.

У працах Д. Уайза «Выкрытая свара цэркваў» (1710) і «У абарону кіравання цэрквамі Новай Англіі» (1717) ідзе размова аб трох тыпах кіравання: манархіі, арыстакратыі, дэмакратыі, якім адпавядаюць формы царкоўнай арганізацыі: папства (епіскапат), прэсвітэрыянства, кангрэгацыяналізм. Д. Уайз аддае перавагу «дэмакратыі ў царкве і дзяржаве». У якасці асновы ён выкарыстоўваў працу нямецкага юрыста С. Пуфендорфа. Замест Святога Пісання як першаснай крыніцы ў грамадскіх справах Д. Уайз прапаноўвае т.зв. «натуральны закон», які ўвасабляецца ў відавочных ісцінах – свабодзе і роўнасці кожнага чалавека. Яго творы істотна ўплывалі на развіццё грамадска-палітычнай думкі, былі перавыдадзены ў 1772 г. і 1860 г. [4, с. 175]. Абсалютная большасць пурытанскіх святароў прызнавала тэорыю Д. Лока ў якасці асноўнай інтэрпрэтацыі грамадскіх адносін. Э. Вільямс у кнізе «Першасныя свабоды і правы пратэстантаў» пісаў: «Крыніца і пачатак усёй грамадскай улады сыходзіць ад людзей...» [5, с. 53]. Аднак не ўсе падзялялі такі пункт гледжання. Святар Д. Аллен ў 1744 годзе выказаў

наступную думку: «Некіруемая супольнасць людзей будзе не лепш чым зграя дзікіх звяроў, якія паядаюць адзін аднаго... Для таго каб папярэдзіць гэта, Бог утварыў грамадзянскую ўладу» [5, с. 53]. Але ён пазначыў, што непасрэдна форму кіравання ўжо абіраюць людзі, а паўнамоцтвы ўлады сыходзяць з канстытуцыі і абмяжоўваюцца ёю.

Пралогам да будучых памфлетаў перадрэвалюцыйнай эпохі лічыцца твор святара-дэіста Д. Мэйх'ю «Дыскурс аб неабмежаваным падпарадкаванні і несупраціўленні вышэйшым уладам» (1750) [6]. Сэнс твора зводзіўся да таго, што паколькі Новы Запавет не адрознівае формы кіравання, то ў межах пэўнай чалавечай супольнасці людзі маюць права на супраціўленне ў выпадку парушэння іх правоў і звычаяў, бо ўлада манарха абмяжоўваецца яго прысягай. Гэта даводзілася са спасылкай на прыклад англійскай рэвалюцыі XVII стагоддзя, дзе асноўную ролю адыгралі пурытане. Д. Мэйх'ю заўважае, што ў Лондане насельніцтва Новай Англіі лічаць духоўнымі нашчадкамі забойцаў Карла I, які прызнаваўся дзяржаўнай англіканскай царквой за пакутніка і ахвяру.

Пытанне аб узаемадачыненні паміж царквой і дзяржавай было вырашана наступным чынам. У грамадска-палітычнай думцы замацаваўся пункт гледжання аб іх падзеле, што фактычна ўжо было ажыццёўлена. Тым не менш у 9 з 13 калоній існавалі т.зв. «устаноўленыя цэрквы», якія праз спецыяльныя падаткі падтрымліваліся ўсім насельніцтвам. Разам з гэтым існавала цэлая сістэма «антыпапісцкіх» актаў, якія абмяжоўвалі дзейнасць каталіцкай царквы.

Да 1763 г. адбыўся працэс станаўлення амерыканскай палітычнай ідэалогіі, якая спалучала як тэорыю грамадскай дамовы Д. Лока, так і кавенантную пурытанскую традыцыю. Гэта знайшло адлюстраванне ў папулярным у перадрэвалюцыйныя гады памфлеце Д. Оціса «Правы брытанскіх калоній» (1764). У творы Д. Оціса першая частка прысвечана высвятленню пытання аб паходжанні дзяржавы і сутнасці ўлады. Вось яго тэзіс: «Вопыт усіх папярэдніх пакаленняў даводзіць, што прырода чалавека, істоты недасканалай, такая, што пажаданыя мэты ён можа дасягнуць пры ўмове, што аб' яднае свае намаганні з намаганнямі яму падобных. У адзіноце чалавеку пагражае пагібель, але, аб'яднаўшыся, людзі непазбежна ўступаюць у канфлікты» [7, с. 86]. Гэты памфлет быў перадрукаваны ў Англіі. А. Кіслова піша аб гэтым: «Уяўленне аб трагічнай перадвызначанасці чалавека да граху пастаянна прысутнічае ў свядомасці нават тых амерыканцаў, якія, здавалася б, далёка адышлі ад рэлігійнага светапогляду і сталі цалкам падтрымліваць пазіцыі рацыяналізму...» [7, с. 86]. Падводзячы вынік, адзначым, што ранняя

амерыканская палітычная ідэалогія з'яўлялася сінтэзам ідэй як англійскага асветніцтва, так і новаанглійскага пратэстантызму.

**Літаратура**


1. *Benson P. L., Willliams D. L.* Religion on Capitol Hill: Myths and Realities. New York, Oxford: Oxford university press, 1986.
2. *May H. F.* The Enlightenment in America. New York: Oxford university press, 1976.
3. *Бурстин Д.* Американцы: колониальный опыт / Под общей ред. и с коммент. В. Олейника. М.: Прогресс. Литера, 1993.
4. *Паррингтон В. Л.* Основные течения американской мысли. Т. 1. Система взглядов колониального периода. М.: Изд. иностр. лит., 1962.
5. *Leder L. H.* Liberty and Authority. Early American political ideology 1689–1763. Chicago: Quadrangle Books, 1968.
6. Інтэрнэт-адрас: http://www.founding.com/ library/ lbody.cfm?id=230&parent=52
7. *Кислова А.* Идейные истоки революции // Война за независимость и образование США/ Под ред. Г. Н. Севостьянова. М.: Наука, 1976.


## ПРАБЛЕМА ЗАХАВАННЯ ПОЛАЦКАЙ ДЫНАСТЫІ РАГВАЛОДАВІЧАЎ У К.10–П.11 стст.


**Д. І. Кузьма**


У апошняй чвэрці 10 ст. полацкі пасад займаў князь Рагвалод. Наяўнасць дарослых (прынамсі – Рагнеды) дзяцей сведчыць аб тым, што Рагвалод быў ужо сталага веку, а, значыць – мог ужо працяглы час кіраваць Полаччынай, і нават можна меркаваць, што ўжо ў той час ён заняў гэтую пасаду як законны спадчаемца, бо на карысць гэтай высновы будзе сведчыць як вяртанне яго ўнука Ўсяслава на Палаччыну нармальна ўспрынятае мясцовым насельніцтвам, а пасля – княжэнне яго сыноў у Полацку, так і трывалае становішча адрадзіўшайся дынастыі Рагвалодавічаў сярод мясцовага насельніцтва, у свядомасці якога панавала думка, што толькі нашчадкі Ронвалода маюць законныя правы на полацкі пасад. Дакладна невядома з каго пачалася полацкая дынастыя, але яна безумоўна, мае досыць высокі варажскі пачатак [1, с. 13]. Так, Уладзімір, зняславіўшы полацкую князеўну Рагнеду, узяў яе ў жонкі, што, нягледзячы на вялізарны гарэм Уладзіміра (каля 800 наложніц), сведчыла аб яе высокім статусе, а значыць- і статусе яе дзяцей. Акрамя Рагнеды ў Уладзіміра было яшчэ чатыры жонкі, якія таксама былі высокага сацыяльнага паходжання. Да таго ж пабранне з Рагнедаю (досыць высокамернаю, калі верыць сведчанням летапісу, што было характэрна для арыстакратычных асобаў) аўтаматычна ўздымала і статус Уладзіміра найперш у вачах варажскага акружэння, які, з'яўляючыся «рабынічам» – сынам рабыні-князеўны Малушы, меў патрэбу ў